УДК 947.6-021.121

# Рэфарматарская дзейнасць Паўла I

Багдановіч А.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

У артыкуле на аснове вывучэння літаратурных крыніц аналізуецца рэфарматарская дзейнасць расійскага імператара Паўла I, які за 4 з паловай гады праўлення Расійскай імперыяй выдаў 2179 разнастайных указаў і маніфестаў у сярэднім 42 у месяц. За непараўнальна болш доўгі перыяд праўлення вялікага рэфарматара Пятра I іх было выдадзена 3296.

Павел I распачаў шматлікія, часам супярэчлівыя рэформы: абмежаваў паншчыну 3 днямі і адначасова істотна павялічыў колькасць прыгонных сялян праз увядзення паншчыны там, дзе яе раней не было; істотна павысіў боездольнасць арміі праз умацаванне яе каманднага і салдацкага складу і адначасова ўвеў нікому не патрэбную прускую муштру. Ён выдае указ аб наследванні прэстолу, які быў складзены такім чынам, што не дазваляў больш жанчынам заняц прэстол і кіраваць дзяржавай. Яму належыць ідэя стварэння замест калегій міністэрств, прызнанне за прыгоннымі сялянамі права прысягаць імператару, павелічэння асігнаванняў на навуковыя даследаванні, навядзенні парадку у справаводстве і архіўнай справе. У галіне саслоўнай палітыкі Павел распачаў шэраг крокаў па ліквідацыі "дваранскіх вольнасцяў", абвешчаных Кацярынай II.

У Беларусі ў цэлым не мянючы сутнасці вялікадзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі, ён паспрыяў паслабленню націску праваслаўнага духавенства на ўніятаў і на пэўны час прыпыніў гвалтоўны іх перавод ў праваслаўе.

У цэлым рэформы Паўла I прынеслі многа карысці далейшаму развіццю Расійскай імперыі, аднак паспешнасць у іх правядзенні, імпульсіўнасць, часам непрадуманасць распараджэнняў і ўказаў дрэнна ўспрымаліся тагачасным грамадствам і асабліва дваранствам. Менавіта таму праціўнікі рэформ склалі загавар, які прывеў да забойства імператара.

За няпоўныя пяць гадоў кіравання краінай Павел I падрыхтаваў базу для рэформаў сваіх сыноў Аляксандра I і Мікалая I, у некаторай ступені нават для рэформаў унука Аляксандра II. Далёка не ва ўсім Павел I атрымаў поспех, але яго палітыка не была бессэнсоўнай. Расія выйшла з XVIII стагоддзя магутнай дзяржавай, з якой лічыліся ва ўсім свеце, а пераемнікі Паўла заняліся – таксама з пераменным поспехам – уладкаваннем дзяржавы